МУЖНАСЦЬ САПЁРА

Пётр Ягоравіч Кандраценка нарадзіўся ў 1923 г. у в. Ажогіна Смаленскай вобласці. Вызначыўся 23—27 чэрвеня 1944 года пры прарыве варожай абароны непадалёку ад Віцебска.

...Загад камандзіра сапёрнага батальёна быў кароткім:

— Пойдзеш у штурмавы батальён. Будзеш з імі ў час прарыву абароны.

Сержант Кандраценка прыйшоў туды пасля поўдня. Па звілістай траншэі знайшоў бліндаж камбата. Прадставіўся:

— Сапёр Кандраценка прыбыў у ваша распараджэнне. Загадана зрабіць праходы ў мінных палях.

Камандзір штурмавога батальёна ўзрадаваўся:

— Своечасова цябе, сяржант, прыслалі. Усё гатова, а праходаў няма.

— Будуць, таварыш капітан, — адказаў Кандраценка. — Вы ўжо намецілі, дзе іх трэба рабіць?

— Намеціў, сержант, намеціў, — адказаў яму камбат. — Вось, глядзі.

Калі былі ўдакладнены месцы і час размініравання, капітан спытаў:

— Якая спатрэбіцца дапамога?

— Дайце двух аўтаматчыкаў, каб адцягвалі міны. Іх тут панатыкана, не прайсці...

— Аўтаматчыкі будуць.

У прыцемку Кандраценка разам з аўтаматчыкамі пайшлі да міннага поля. А калі наступіла кароткая чэрвеньская ноч, ён папоўз наперад. Абазначыўшы чырвонымі флажкамі граніцу будучага праходу, прыняўся за справу. Працаваў спакойна і ўважліва. Выкарыстоўваючы мінашукальнік і шчуп, знаходзіў міны, асцярожна іх раскопваў і абясшкоджваў. Перадаўшы міну аўтаматчыкам, сам прымаўся за другую.

Каля гадзіны Кандраценка працаваў спакойна. Але за гэты час ён прасунуўся ўшчыльную да варожых акопаў і размініраванне стала небяспечным: гітлераўцы перыядычна пускалі ракеты, а потым адкрывалі хаатычную стральбу. Адна шалёная куля магла выпадкова трапіць у сапёра або ў міну. Калі варожая ракета ўзлятала ўверх, сяржант спыняў работу, прыціскаўся да зямлі і замірáў да таго часу, пакуль ракета не пагасне. У цемнаце ён зноў браўся за сваю небяспечную справу і настойліва прасоўваўся да краю міннага поля. А яно абрывалася ўсяго ў некалькіх метрах ад першай лініі акопаў праціўніка, ля самай драцянай загароды.

Пётр Кандраценка падпоўз да загароды, дастаў ножны і хацеў было пачаць рэзаць дрот, як успыхнула адразу некалькі ракет і над галавой засвісцелі кулі. Сапёр прыгнуўся да зямлі, падумаў з трывогай: «Няўжо заўважылі?». Ён ляжаў нерухома, прыслухоўваючыся да свісту куль. Але кулі ляцелі над ім і недзе лявей таго месца, дзе ён ляжаў. «Значыць, не заўважылі мяне», — супакоіў сябе сяржант і, калі пагаслі ракеты, узяўся зноў за ножны. Праз мінуту першая нітка дроту бясшумна лягла на зямлю, за ёй другая, трэцяя, чацвёртая...

Усю ноч працаваў сапёр Кандраценка, робячы праходы ў мінных палях. Калі на ўсходзе стала разгарацца зара новага дня, ён закончыў з чацвёртым праходам. Прарабіць нават адзін праход у мінным полі ворага — справа нялёгкая. Прарабіць жа чатыры такія праходы ў дзесяць разоў цяжэй. І аб гэтых цяжкасцях гаворыць толькі адзін факт: за адну ноч сяржант Кандраценка зняў у праходах на зямлі віцебскай 387 варожых мін.

Сонца ўжо запунсавела на ўсходзе, калі сяржант вярнуўся з аўтаматчыкамі ў траншэю штурмавога батальёна. Капітан чакаў сяржанта. Але ён не паказаў сваёй радасці, а толькі спытаў:

— Усё гатова?

— Так точна, таварыш капітан. Гатовы чатыры праходы ў полі і ў драцянай загародзі.

— Можаце вяртацца ў свой батальён, — сказаў камбат і насунуў шчыльней каску. — Хутка мы пойдзем у атаку.

— Дазвольце і мне з вамі, — папрасіў Кандраценка.

Камбат паглядзеў на сапёра, крыху памаўчаў.

— А твой камбат што скажа?

— толькі і спытаў сяржанта.

— Ён дазволіў мне застацца ў вашым батальёне.

— Заставайся...

Сігнал атакі прагучаў раптоўна, хаця ўсе яго чакалі. Байцы батальёна дружна ўзняліся і кінуліся па праходах да варожых траншэй. Аглушаныя артылерыйскай падрыхтоўкай, гітлераўцы не адразу апрытомнелі. І ўсё ж уварваўшыхся ў акопы байцоў яны сустрэлі ярасным супраціўленнем. Рукапашны бой закончыўся разгромам ворага. Нашы воіны рушылі далей, да другой лініі варожых акопаў. Тут іх сустрэў агонь кулямётаў. Байцы заляглі ля самай траншэі. Кандраценка папоўз наперад і скокнуў у акоп. Ён убачыў лявей агнявую кропку. За кулямётам стаяў нямецкі афіцэр, а два салдаты дапамагалі яму. Сапёр кінуў гранату. Выбух звалiў намёртва і афіцэра і салдат. Батальён узняўся і змёў заставўшыхся ў акопах гітлераўцаў.

Два дні полк вёў упартыя баі, прасоўваючыся да шашы Віцебск —Лепель. А калі батальён, у саставе якога сяржант Кандраценка біў ворага, выйшаў да шашы, завязалася з фашыстам ярасная бойка. У гэтым баі Пётр Кандраценка яшчэ раз праявіў мужнасць. Адважны сапёр агнём аўтамата знішчыў 18 варожых салдат, а 24 салдат і афіцэраў прымусіў скласці зброю і здацца ў палон. У ходзе гэтага бою батальён захапіў калону аўтамашын. І зноў спатрэбілася дапамога сапёра: гітлераўцы паспелі замініраваць аўтамашыны. Кандраценку давялося зняць 22 міны-сюрпрызы, каб потым можна было пасадзіць воінаў батальёна ў грузавікі і рушыць на праследаванне ворага.

Амаль праз месяц пасля гэтых баёў у 334 дывізію прыйшла радасная вестка: Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 22 ліпеня 1944 года адважнаму сапёру сяржанту Пятру Ягоравічу Кандраценку было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза.

М. САЛАЎЁЎ.